# УЧАСТНИКИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

## Абараняючы Гомель



**Многія гамяльчане памятаюць батальённага камісара Пятра Сямёнавіча Суслава. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ён узначальваў гарадскі ваенны камісарыят. Выбіраўся членам гаркома КП(б)Б і дэпутатам гарадскога Савета. Вялікія яго заслугі ў абароне Гомеля ў 1941 годзе. У абласным краязнаўчым музеі захоўваецца баявая характарыстыка на П. С. Суслава, падпісаная былым начальнікам Гомельскага гарнізона і начальнікам ПВА Гомеля генерал-маёрам І. Н. Беразоўскім. Вось што ў ёй гаворыцца:**

«За час сумеснай баявой дзейнасці па абароне Гомеля з 8 па 19 жніўня 1941 г. т. Суслаў выканаў выключна вялікую работу. Пагарджаючы небяспекай і не шкадуючы свайго жыцця, пад пастаяннай бамбардзіроўкай варожай авіяцыі ён мужна і настойліва эвакуіраваў з горада матэрыяльныя каштоўнасці, сфарміраваўшы для гэтай работы роту з 250 чалавек і аўтакалону з 30 грузавых машын. Вывезена да 85 тысяч тон рознага металу, да 600 тысяч тон харчовых рэсурсаў. Апошнія 19 вагонаў зерня з элеватара былі вывезены пад прыкрыццем бранянпоезда ў дзень пакідання горада нашымі войскамі. Зняты ўсе медныя правады тэлеграфна-тэлефоннай лініі і правады электрасеткі высокага напружання.

Арганізаваў і кіраваў рыццём 13-кіламетровага процітанкавага рова, барыкад і іншых процітанкавых перашкод...

З 12 па 19 жніўня вораг штодзённа бамбіў горад. Усе гэтыя дні і ночы тав. Суслаў не пакідаў вуліц, арганізоўваў тушэнне пажараў, рамонт электрычнай і водаправоднай сеткі, тэлефоннай сувязі. У выніку ўсе абаронныя, камунальныя і бытавыя прадпрыемствы працавалі да апошняга.

Апошнія трое сутак т. Суслаў непасрэдна кіраваў абаронай горада: выязджаў у перадавыя часці, арганізоўваў разведку праціўніка, забяспечваў часці боепрыпасамі, харчаваннем, папаўняў рэзервамі.

У яго не было слоў — «не» або «немагчыма». У выніку ўсіх мерапрыемстваў, выкананых у гэты перыяд, нашы часці храбра і мужна абаранялі Гомель.

У гэтым вялікая заслуга належыць і т. Суславу.

19 жніўня ўвесь дзень пад артылерыйскім і мінамётным агнём, пад бамбёжкай з паветра, якая не спынялася, т. Суслаў асабіста кіраваў пераправай цераз Сож, праяўляючы пры гэтым гераізм. Толькі з апошнімі падраздзяленнямі пакінуў горад.

Тав. Суслаў як гомельскі гарадскі ваенны камісар быў адным з першых ініцыятараў, арганізатараў і кіраўнікоў абароны горада і за баявыя заслугі перад Радзімай дастойны ўрадавай узнагароды».

Вялікі жыццёвы шлях прайшоў Пётр Сямёнавіч Суслаў, камуніст з 1922 года. Доўгі час ён служыў у радах Чырвонай Арміі. Ад радавога чырвонаармейца вырас да палкоўніка. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны І ступені і медалямі.

Памёр Пётр Сямёнавіч у 1963 годзе ў Маскве.

**М. ЦАРКОЎ,**
**старшы навуковы супрацоўнік абласнога краязнаўчага музея.**